# Беларускае пытанне ва ўкраінска-трансільванскіх адносінах у сярэдзіне XVII ст.

*Серко Я. В., студ. IV к. БДПУ ім. М. Танка,*
*навук. кір. Федарасава В. Г.,*
*канд. гіст. навук, дац.*

У сярэдзіне XVII ст. Рэч Паспалітая, аслабленая казацкім паўстаннем Б. Хмяльніцкага, стала аб'ектам варожай агрэсіі суседніх дзяржаў. Беларускія землі рэспублікі двух народаў прыцягвалі ўвагу Маскоўскай дзяржавы, Швецыі, Войска Запарожскага, Трансільваніі (Сямігароддзя), уладары якіх планавалі ўключыць беларускія тэрыторыі ў склад сваіх дзяржаў. Найбольш актыўным удзельнікам антыпалькіх і антылітоўскіх кааліцый была ўзнікшая ў выніку Украінскай нацыянальнай рэвалюцыі паўаўтаномная дзяржава Б. Хмяльніцкага, які намагаўся, кіруючыся канфесіянальнымі і нацыянальнымі матывамі, аб'яднаць пад сваёй уладай землі, што ўваходзілі ў склад Кіеўскай Русі. Акрамя этнічных украінскіх тэрыторый, у склад дзяржавы планавалася ўключыць беларускія Падняпроўе і Палессе. Для ідэалагічнага абгрунтавання такіх прэтэнзій казакі выкарыстоўвалі рэлігійны фактар — бачылі сваю дзяржаву ў межах, якія мела Кіеўская праваслаўная мітраполія да Берасцейскай уніі 1596 г. [1, с. 246]. Але складанасць вядзення вайны супраць Польшчы і Літвы вымушала Хмяльніцкага шукаць моцнага саюзніка, якім магло б стаць Трансільванскае княства. Уладары Сямігароддзя марылі адрадзіць «Вялікую Вугоршчыну» у складзе вугорскіх, польскіх, часткова ўкраінскіх і беларускіх земляў. Прэтэнзіі трансільванскіх князёў з дынастыі Ракочы грунтаваліся на тым, што вугорскі кароль Людвік I, які ў 1370 г. стаў таксама і каралём польскім, меў у васальнай залежнасці Галіцка-Валынскае княства, у склад якога ўваходзіла Берасцейшчына. У верасні 1648 г. украінскі гетман усталёўвае кантакт з трансільванскім князем Юрыем (Дзьёрдзем) I Ракочы і абяцае падтрымаць яго паход на Польшчу. Але жаданню князя пасадзіць на трон Рэчы Паспалітай свайго сына Жыгімонта не было наканавана збыцца: Юры I памёр. Украінска-трансільванскія адносіны працягвалі развівацца пры наступным князе, Юрыю II Ракочы. Пасля падпісання казакамі Збораўскай дамовы ў 1649 г. князь запэўніў Хмяльніцкага, што ён можа разлічваць на падтрымку, але папрасіў часу для падрыхтоўкі дыпламатычнай глебы для магчымага выступлення супраць Рэчы Паспалітай [2, с. 136]. У перамовах тэрытарыяльныя пытанні не падымаліся, гаворка ішла толькі аб сумесным паходзе. Але неўзабаве з-за ўмяшання Хмяльніцкага ў малдаўскія справы адносіны паміж саюзнікамі пагоршыліся.

Новы этап збліжэння Трансільваніі і Украіны пачаўся ў 1656 г., пасля падпісання паміж Рэччу Паспалітай і Масковіяй Віленскага перамір'я, якое ўшчамляла інтарэсы казацтва. У верасні таго ж года быў падпісаны «вечны мір» паміж Сямігароддзем і Войскам Запарожскім [3, с. 85]. Па дамове заходнеўкраінскія землі і «Белая Русь»

адыходзілі да сферы інтарэсаў казакаў, а Малая і Вялікая Польшча — Трансільваніі. Дадзеную дамову можна разглядаць як дыпламатычны крок Ракочы па прыцягванню Хмяльніцкага да антыпольскай кааліцыі, бо ні Сямігароддзе, ні Швецыя не планавалі аддаваць казакам якія-небудзь землі Вялікага Княства Літоўскага, што бачна з інструкцыі шведскаму паслу ва Украіне Г. Вэлінгу і шведска-трансільванскіх перамоў [5, с. 194].

Кульмінацыйным момантам дыпламатычнай барацьбы за магчымасць атрымаць беларускія землі стала падпісанне ў снежні 1656 г. Радноцкай дамовы паміж Швецыяй, Трансільваніяй, Брандэнбургска-Прускім курфюрствам і Войскам Запарожскім аб падзеле Рэчы Паспалітай. Па 5 і 6 артыкулах дамовы Трансільванія атрымлівала частку польскіх, заходнеўкраінскія землі, а таксама Берасцейшчыну. Казакам у іх прэтэнзіях было адмоўлена, але тым не менш Хмяльніцкі даў згоду ўдзельнічаць у паходзе на Польшчу, спадзяючыся на перагляд тэксту дамовы. Казацкія аддзелы на чале з І. Багуном і А. Ждановічам увайшлі ў склад кааліцыйнай арміі і прымалі ўдзел у захопе Бярэсця, якое было перададзена пад уладу Ракочы. Такім чынам, Сямігароддзе не пайшло на саступкі казакам і паспрабавала ўмацавацца ў рэгіёне, захапіўшы яшчэ і Кобрын. Але стварэнне антышведскай кааліцыі і сыход шведскіх войск з Рэчы Паспалітай змянілі сітуацыю ў рэгіёне — казацкія і трансільванскія войскі вымушаны былі пакінуць межы Вялікага Княства Літоўскага.

Аналізуючы ўкраінска-трансільванскія адносіны, можна прасачыць за развіццём асноўных напрамкаў знешняй палітыкі ўкраінскага гетманата і Сямігароддзя. Іх зацікаўленнасць у аслабленні Рэчы Паспалітай і падзеле яе тэрыторый стваралі базу для ўтварэння моцнай кааліцыі, але жаданне кожнага з саюзнікаў атрымаць заходнеўкраінскія і беларускія землі рабіла дасягненне поспеху немагчымым.

## Літаратура

1. Катлярчук, А. У ценю Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швэцыя у часе эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст. — Мінск, 2010. — 305 с.

2. Русская и украинская дипломатия в Евразии: 50-е годы XVII века / Научное издание; редкол.: Б. Н. Флоря (отв. ред.) [и др.]. — М.: Институт славяноведения РАН, 2000. — 224 с.

3. Frost, Robert I. After the Deluge: Poland and the Second Northern War, 1655–1660 / Robert I. Frost. — Cambridge University Press, 2003. — 211 p.

4. Смолій, В. А. Українська національна революція XVII ст. (1648–1676 рр.) / В. А. Смолій, В. С. Степанков. — К.: Видавничий дім «Альтернативи», 1999. — 352 стор.